**УДК 904+94(476)**

# ХРАМ У МІФАПАЭТЫЧНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ ЖЫХАРОЎ УШАЧЧЫНЫ

***Н.А. МІЗЯРСКА***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ)***

*У артыкуле разглядаецца роля храма ў міфапаэтычнай карціне свету беларусаў Ушаччыны, семіятычны статус і рытуальныя функцыі якога і сёння маюць вялікае значэнне, у параўнанні з культавымі канонамі хрысціянства.*

Асобнае месца ў міфапаэтычнай карціне свету і структуры традыцыйнага культурнага ландшафту беларусаў займае храм, які ў большасці этнакультурных традыцый ёсць “праўдзівым святым месцам, домам багоў” [10, с.293]. Яшчэ ў вялікіх усходніх цывілізацыях храм з’яўляўся зямной рэпрадукцыяй адной з мадэляў вышэйшага свету, лічыўся сапраўдным святым месцам – жыллём Багоў. Храм пастаянна асвяшчае свет, які ён адлюстроўвае і мае ў сабе. Дзякуючы храмам і святым алтарам, грэшны свет ачышчаецца [13, с.43-44]. Некаторыя беларусы і сёння яшчэ называюць абраз “Богам”, а храм – яго жыллём: “Канешне, храм – эта дом бога, я іду ў храм, як у госці к Богу. І ікона – эта Бог, а як жа? А я ж хрышчусь, на калені станаўлюсь перад этай іконай” [9]. Храм вылучаецца сярод іншых элементаў традыцыйнага культурнага ландшафту больш высокім статусам, бо ён будуецца і функцыяніруе з улікам вышэйшай сімвалічнай прагматыкі, а не прагматыкі ўлітарна-гаспадарчай. Храм (свяцілішча, капішча, касцёл, царква, капліца) прызначаны для камунікацыі паміж светам людзей і сакральнай сферай. Таму ў міфапаэтычнай карціне свету храм выступае як “цэнтр усёй сакральнай прасторы”, як прадметнае ўвасабленне ідэі “сусветнага дрэва”, “сусветнай восі”, якая злучае ўсе сферы светабудовы [10, с.294].

Храм, па меркаванню вясковага насельніцтва, часта параўноўваюць з сонцам, якое грае на Вялікдзень ці Купалу, разбягаючыся на дзесяткі свяцілаў, каб адарыць усіх і кожнага сваёй энергіяй, а потым сабрацца і застацца непарушным, як і увесь гэты свет. Так, згодна з народнай традыцыяй, сонца і храм з’яўляюцца найвышэйшымі каштоўнасцямі аднаго парадку. Па словах ушацкіх інфармантаў, на храм і сонца нельга паказваць пальцамі, ці рукой: “Я чула яшчэ ў маленстве, што на сонца і месяц нельга паказваць пальцам, пакарае Бог. Гэта мне казала мая бабуля” [8]. Па словах былой настаўніцы, Відзевіч В.П., на абраз таксама нельга паказваць пальцамі: “Я хачу сказаць, што і касцёл, або царква, абразы – гэта ўсё святое, таму патрэбна з пашанай адносіцца да іх” [2]. Здаўна на Беларусі людзі з вялікай пашанай адносіліся да абразоў і царкоўных рэчаў, бо ў зваротным выпадку яны маглі быць пакараныя Богам. Па словах былой настаўніцы Каваленка А.Б. вядома аб такіх здарэннях: “Бацька мой расказваў, што пасля вайны цярэшку жанілі ў нашай вёсцы. Адной маладой дзяўчыне не хапіла пары, дык яна схапіла са сцяны ікону з выявай Езуса Хрыста, і давай з ёй танцаваць. Вось мая пара якая! Яна зрабіла некалькі кругоў і заваліласа. Не, прачнулася і памерла хутка» [5].

Храм як знакавая прастора быў найбольш функцыянальны ў рытуальна вылучаныя прамежкі часу, незалежна ад тыпу абрадавай сітуацыі – сямейнай ці каляндарнай. Пры гэтым кадаваная інфармацыя магла датычыць як асабістай долі чалавека (напрыклад, калі хто ў храме чхнець на вялікае свята, то на другі год іншага свята не дачакаецца), так і свету ў цэлым [10, с.295]. Храм выступае індэфікатарам лакальнай супольнасці, бо з’яўляецца цэнтрам свету, прыходам з некалькімі вёскамі, жыхары якіх пацвярджаюць сваю прыналежнасць у рамках гадавых, храмавых святаў, фэстаў. Чужынцы ў сваю чаргу доступу да храма не маюць і павінны наведваць свае храмы.

Храм, як цэнтр крызіснай сеткі, праз якую найбольш эфектыўна здзяйсняецца дараабмен паміж светам людзей і сакральнай сферай, калі ў выніку ахвяравання, абракання людзі могуць атрымаць зваротны дар – аднаўленне жыццёвага ладу і парадку ў межах лакальнай супольнасці. Храм, як цэнтр Сусвету і месца сакральнай чысціні, часта фігуруе ў якасці “крызіснага цэнтра” у адным з жанраў фальклору, замовах ад хваробаў [10, с 298]. На Ушаччыне вядомыя замовы, дзе ўжываецца царкоўная атрыбутыка: “Як загаварваць рожу. Напачатку перахрысціцца і на адным дыханні, хутка прамовіць 3 разы. После таксама перахрэсціцца. Ішоў Езус Хрыстус цераз тры полі чыстых, а пры ім дванадцаць рож: першая – з пумя, другая – з камя,трэцяя – вадзяная, чацвёртая – падзіўная, пятая – ветраная, шостая – вроч, сёмая – белая, восьмая – касцявая, дзевятая – агнявая, дзесятая – гняздо ўвівалі, адзінадцатая – лятуха, дванадцатая – паўзуха. З гэтых усіх можыць састаяць рожа” [6]. Па словах Каваленка А.Б., калі чалавека сурочылі і нешта яму баліць, то патрэбна зрабіць наступнае: “ Вечером, на заход солнца, абмыть стол водой крестообразно 3 раза, прочитать молитву «Ойче наш». И остатками воды помазать больное место. Боль должна утихнуть” [5].

Сімвалічная мяжа паміж чыстым і нячыстым, якая ўвасабляецца царкоўнымі дзвярамі, або парогам, выкарыстоўваецца і на індывідуальным узроўні [10, с 298]. Так, па словах інфарматкі з вёскі Пліна Ушацкага раёна Пашута В.Ф., вядома: "Я чула, што даўней пры цяжкіх родах адкрывалі Царскія вароты ў храме" [8].

У выніку дараабмену з канкрэтнымі сакральнымі аб'ектамі (храм, крыніца-прошча, ахвярны крыж, капліца), на першае месца выходзіць канцэрцыя ахвяравання і абракання, якая існуе ў народнай свядомасці і практыках беларусаў. На Ушаччыне за пакуту веруючыя людзі не толькі ахвяруюць у храм грошы, але таксама вытрымліваюць пасты, чытаюць штодзённа малітвы, што вядома па словах інфармантаў: "Мне Бог дапамагае, я яго прашу і ён чуе. Ахвярую апошнія грошы часам у храм, вытрымліваю пасты, шчыра малюся і ён мяне чуе" [4]. " На храм нужно жертвовать и не жалеть, Господь воздаст потом сполна" [3].

Асаблівай формай крызіснай камунікацыі паміж калектывам і храмам ёсць ахвяраванне абыдзённых рэчаў. Гэтыя рытуалы аказіяльнага тыпу абслугоўваюць крызісныя сітуацыі, якія ствараюць рэальную пагрозу ўсёй супольнасці: вайна, пошасць, засуха. Найчасцей у якасці абыдзённай ахвяры фігуруе палатно: намітка, ручнік [10, с. 302]. Абыдзённік – ручнік, ці кавалак палатна, вытканы калектыўна жанчынамі сяла на працягу дня ў пэўнай крызіснай сітуацыі: пры эпідэміі, вайне, падчас засухі, градабою і іншых няшчасцях. У некаторых мясцінах абыдзённік ткалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта выглядала наступным чынам: у адной хаце за дзень ці за ноч жанчыны (часам толькі старыя "чыстыя", удовы, ці дзяўчаты) пралі кудзелю і ткалі рушнік. Атрыманую тканіну ахвяравалі ў царкву, або вешалі на абраз ці крыж на ростанях, абыходзілі з ім вакол вёскі. Абыдзённаму рушніку прыпісвалася ўласцівасць увабраць у сябе рэальнае зло або служыць неадольнай перашкодай для яго пранікнення ў жыццёвае кола людзей [1, с.14].

У межах каляндарнага года ў храме асвячаліся розныя рэчы і прадметы, якія мелі высокі семіятычны статус у традыцыйнай супольнасці [10, с.303]. На Ушаччыне, па словах Пашута В.Ф, вядома, што праваслаўныя вернікі таксама прытрымліваюцца гэтай традыцыі:" У храмах на святы асвячаюць ваду. Яе п'юць ад розных хвароб, каб прагнаць злых духаў і ўмацаваць веру. Для асвячэння жылля, усіх пабудоў і нават, ёй акрапляюць жывёлу ад хвароб і сурокаў. Асвячаюць алей для памазання хворых у таінстве соборования. После Пасхі асвячаюць святы хлеб – Артос для здоровья душі і тела, яго ядуць со святой вадой. Асвяцаюць прасфоры, на каждой літургіі для того ж. Стравы розныя асвячаюць на Пасху. На памінальным стале – памінальную куццю і другія стравы за ўпакой памерлых" [8]. У католікаў, па словах былой настаўніцы Леановіч А.А., на святы асвячаюць наступныя рэчы: "На Вялікдзень – стравы; на Цела і Кроў Пана – зёлкі; на Святога Лаўрэна – мёд і хлеб; на нараджэнне Панны Марыі – зерне" [7].

Храм у міфапаэтычнай карціне свету выступае як дзейсны сродак і канал камунікацыі з іншасветам, дзе магчымыя звышнатуральныя метамарфозы, таму цэрквы часта ўспрымаліся сялянамі, як чарадзейскія месцы, а святары – валхвамі і чараўнікамі. У храмах практыкаваліся розныя магічныя дзеянні, скіраваныя як на добрыя ўчынкі (каб добра вялася гаспадарка), так і на шкодныя (на хваробу, ці смерць чалавека) [10, с.306]. Вядома, што ва Ушачах выкарыстуюць любоўную магію, з мэтай прываражыць да сябе мужчыну або жанчыну: "Берёшь фатакартку мужчыны і кладёшь сабе за пазуху, каб датыкалася голага цела і ідёшь з ёй у царкву, купляешь дзве свечкі і ставішь каля іконы Багародзіцы і гаварышь ціхонька – как дзве свечы гараць, пагараюць, так і я раба Божая (імя сваё) з рабом Божым (яго імя) вянчаюсь. Мілый і любімый он сейчас са мной, бо царква вянчала і Багародзіца памагала. Чорнае вянчанне з маёй халастой жызню прашчанне" [6]

Рытуальна-сімвалічныя функцыі храма выяўляюцца і ў рамках хранатопа, які злучае ў непарыўным адзінстве сакральную прастору і сакральны (святочны) час. Свята, як сакральны прамежак часу, характарызуецца забаронай (поўнай ці частковай) на працу гаспадарчую, выключна ўтылітарную. На першы план выходзяць каштоўнасці сімвалічнага кшталту і рытуальныя формы паводзінаў, бо самое свята атрымлівае санкцыю "не з свету сродкаў і неабходных умоваў, а з свету вышэйшых мэтаў чалавечага існавання, з свету ідэялаў [10, с.310]. Беларусы Ушаччыны і сёння лічаць, што за працу пад час галоўных царкоўных святаў Бог абавязкова пакарае чалавека: "Вось заўсёды, як свята, мой сусед працуе, як быццам болей іншага часу няма. І вось, працаваў ён на Вялікдзень і пілой адрэзаў сабе пальцы на руцэ. Бог яго пакараў" [5].

Людзей, якія бурылі храмы ў гады савецкай улады, звычайна напаткаў няшчасны лёс: "Цэркву да вайны бурылі, вот гэта я дужа ня помню. Ну пабурылі яе, а калі? Вродзі бы у нас такі мужчына быў, Арцем звалі, там сусед мой. Калакала гэта сьнімаў, усё гэта сьнімаў. Ну дык, вот ён тады як забалеў. Забалеў плахой хваробай, ляжаў доўга. Во, рак гэты стаў у яго. Дык вот гаварылі, што за гэта яго Бог наказаў, што ён сьнімаў ужо ўсе гэта, царкоўнае" [12, с. 290]. На Ушаччыне ў вёсцы Чартсвяды вядомы наступны прыклад: " Во мы прыйшлі на тое месца, дзе была праваслаўныя цэркаўка. Цэрква была баль-

шая, з рознымі падстройкамі. Фундамент бальшы, дужа красівая была, уся акруга, увесь прыход сюды прыязджаў. Вядома ж, тут было мястэчка, імянітае места было. А тады ж, як цэрквы разбуралі, колакалы паскідалі, паскідалі. Узарваць яе не ўзарвалі, яна стаяла, тут разнае хазяйства вялося. А тут вайна granула, як бамбілі, часць цэрквы разарылі, крыло цэрквы. А тады ў пасляваенныя гады строіліся ж, і пліты і чосаныя камяні, гэта ўсё забіралі з парога, пазней і з фундамента. А часць цэрквы яшчэ стаяла. І вот чалавек, помняць яго – Міхаіл Сцяпанаў, фамілія Грак. Палез скідваць кірпічча, а тады слез далоў, сеў, а глыба звалілася і насмерць яго забіла…” [11, с.289-290].

Такім чынам, даследуючы храм у міфапаэтычнай карціне свету беларусаў Ушаччыны, можна прыйсці да высновы, што яго семіятычны статус і рытуальныя функцыі, якія абапіраюцца на міфалагічную аснову і сёння маюць вялікае значэнне, у параўнанні з культавымі канонамі хрысціянства. Такім чынам сярод найбольш значных міфарытуальных функцый храма можна вылучыць наступныя: храм, як сакральная зона ў народнай традыцыі ушачан выступае прасторай сакралізацыі некаторых прадметаў і рэчаў (вада, хлеб і інш.), якія надзяляюцца высокім сімвалічным статусам; храм, як цэнтр свету, выступае ў шматлікіх магічных аперацыях пад час святаў, як цэнтр “крызіснай сеткі” – месцам пазбаўлення хваробаў і катаклізмаў; храм, як месца ахвяравання (абракання), у выніку чаго аднаўляецца жыццёвы парадак і дабрабыт; у міфапаэтычнай карціне свету ушачан храм увасабляе традыцыйныя ўяўленні пра сакральны і прафанны час, нармалізуючы паводзіны людзей.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.
2. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Відзевіч Валянціны Пятроўны, 1953 г.н., у г.п. Ушачы.
3. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Власенка Любоў Пятроўны, 1942 г.н., у г.п. Ушачы.
4. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Ісаковіч Валянціны Эдуардаўны, 1950 г.н., у г.п. Ушачы.
5. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Каваленка Алены Баляславаўны, 1950 г.н., у г.п. Ушачы.
6. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Кірпічонак Ганны Іванаўны, 1939 г.н., у в. Баброва Ушацкага р-на.
7. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Леановіч Алены Аляксандраўны, 1953 г.н., у в. Пліна Ушацкага раёна.
8. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Пашута Веры Фёдараўны, 1968 г.н., у в. Пліна Ушацкага раёна.
9. Запісана Мізярска Н.А. у 2017 г. ад Сарока Аліны Казіміраўны, 1940 г.н., у г.п. Бешанковічы.
10. Лобач, У.А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. Лобач. – Мінск : Тэхналогія, 2013. – 510 с.
11. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2 / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.
12. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2. Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 292 с.
13. Ходзька, І. Успаміны квестара / І. Ходзька ; пер. з пол. мовы і камент. М. Хаўстовіча. – Мінск : Universitas, 2007. – 197 с.